# З 13 па 16 ліпеня 2023 г. адбудзецца XXXII Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску"

"Славянскі базар" - унікальны маштабны культурны форум, "фестываль фестываляў", які стаў сапраўды культурным брэндам Беларусі. Нязменным застаецца яго дэвіз - "Праз мастацтва - да міру і ўзаемаразумення".

Асноўнымі падзеямі фестывалю стануць урачыстая цырымонія і гала-канцэрт адкрыцця (13 ліпеня, Летні амфітэатр), канцэрт "Саюзная дзяржава запрашае..." (14 ліпеня, Летні амфітэатр), XXXII Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск" (14 – 16 ліпеня, Летні амфітэатр), XXI Міжнародны дзіцячы музычны конкурс "Віцебск" (13 - 14 ліпеня, к/з "Віцебск"), цырымонія і гала-канцэрт закрыцця фестывалю (16 ліпеня, Летні амфітэатр) і інш.

З падрабязнай інфармацыяй можна азнаёміцца на сайце фестывалю fest-sbv.by.